20 год Гродзенскай дыяцэзіі (20)

Аўтар: Рэдакцыя
24.11.2011 01:00



2004 год

11 студзеня - Гродна наведаў Апостальскі нунцый кс. абп Іван Юрковіч, які адправіў св. Імшу ў Пабрыгіцкім касцёле.

14 студзеня - Адбылося пахаванне а. Караля Шчэпанюка OFMCap, капуцына, які працаваў у Ліпнішках. Пахавальную св. Імшу ўзначаліў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

4 сакавіка - Кс. бп Аляксандр Кашкевіч асвяціў касцёл у Першамайску (дэканат Ліда).

24 сакавіка - 10-годдзе харытатыўнай арганізацыі “Карытас” у нашай дыяцэзіі. † 30 красавіка – 2 мая - У Лідзе адбыліся Дыя-цэ-зіяльныя дні моладзі пад дэвізам “Мы хочам убачыць Хрыста”.

1 мая - У Скідзелі адбылося асвячэнне касцёла св. Юзафа Рамесніка. Асвячэнне здзейсніў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

29 мая - У катэдральнай базіліцы ў Гродне кс. бп Аляксандр Кашкевіч удзяліў святарскія пасвячэнні шасці дыяканам, выпускнікам ВДС ў Гродне, а таксама пасвячэнні дыяканату двум выпускнікам Гродзенскай семінарыі.

27 чэрвеня - 100-годдзе касцёла ў Суботніках.

1 ліпеня - Мінула 100 гадоў з Дня нараджэння бл. Генрыха Глябовіча.